# Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі як сродак павышэння эфектыўнасці сучаснага ўрока



Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Поразаўская сярэдняя школа"

# Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі як сродак павышэння эфектыўнасці сучаснага ўрока

З вопыту работы творчай групы

2023

ББК 74
I 44

Рэкамендавана метадычным саветам дзяржаўнай установы адукацыі “Поразаўская сярэдняя школа”

Складальнікі:
педагогі ўстановы адукацыі

Рэцэнзент: С.С.Балюк, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі “Поразаўская сярэдняя школа”

I 44 Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі як сродак павышэння эфектыўнасці сучаснага ўрока: з вопыту работы творчай групы/ склад.: педагогі ўстановы адукацыі – Поразава: дяржаўная ўстанова адукацыі “Поразаўская сярэдняя школа”, 2023. – 42с.

Прадстаўлены матэрыялы настаўнікаў - прадметнікаў Поразаўскай СШ. Дадзеныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў практычнай дзейнасці.

# ЗМЕСТ

1. Інфармацыйны бюлетэнь. Выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у рабоце педагога……………………………………………………5
2. Памятка. Магчымасці прымянення ІКТ на розных этапах урока..................8
3. Жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля. Адлюстраванне разнастайнасці жыцця і яго праяў у лірычных мініяцюрах "Загадка", "Трохі пра вечнае". Белава М.В., настаўнік беларускай мовы і літаратуры……………………...11
4.Мастер-класс "Информационно-коммуникационные технологии на урокахрусского языка и литературы". Шимко М.А., учитель русского языка и литературы..........................................................................................21
5. Описание опыта педагогической деятельности. Гончарова М.О., учитель английского языка……...........................................................................25

## Выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у рабоце педагога

**ІКТ (інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі)** – гэта працэсы і метады ўзаемадзеяння з інфармацыяй, якія ажыццяўляюцца з ужываннем прылад вылічальнай тэхнікі, а таксама сродкаў тэлекамунікацыі.



**Асноўныя накірункі выкарыстання ІКТ на ўроках**

- візуальная інфармацыя (ілюстрацыйны, нагляднЫ матэрыял);
- інтэрактыўны дэманстрацыйны матэрыял (практыкаванні, апорныя схемы, табліцы, паняцці);
- трэнажор;
- кантроль за ўменнямі, навыкамі вучняў;
- самастойная пошукавая, творчая работа вучняў.

### На якіх этапах урока лепей выкарыстоўваць ІКТ?

Выкарыстоўваць ІКТ можна на розных этапах урока:

- у час праверкі дамашняга задання;
- пры тлумачэнні новага матэрыялу;
- прадчас замацавання новага матэрыялу;
- у час фарміравання ў вучняў неабходных навыкаў і ўменняў;
- пры самастойнай працы вучняў;
- на этапе паўтарэння і ўзнаўлення матэрыялу (напрыклад, у пачатку і канцы навучальнага года);
- на этапе кантролю ведаў, уменняў і навыкаў;
- падчас работы над памылкамі і г.д.

### Папулярныя сэрвісы, якія можа выкарыстоўваць настаўнік

***LearningApps*** – дазваляе ствараць гульні, крыжаванкі, віктарыны і г.д.
***Easy Notecards*** і ***Quizlet*** – стварэнне флэш-картак.
***Blendspace*** – стварэнне адукацыйных міксаў.
***Smore*** – распрацоўка флаераў.
***Prezi*** – прэзентацыі новага пакалення
***Moodle*** – стварэнне тэстаў і практычных заданняў для вучняў
***OnlineTestPad*** – дае магчымасць выкарыстоўваць ужо гатовыя онлайн тэсты або ствараць свае ўласныя.

***Сэрвісы Google*** – гэта цэласная сістэма, доступ да якой атрымлівае любы ўладальнік акаўнта Google. Яны з'яўляюцца зручным і досыць простым інструментам інавацыйных педагагічных тэхналогій дзейнаснага тыпу. Сярод сэрвісаў Google найбольш запатрабаванымі і спрыяльнымі вырашэнню асноўных адукацыйных задач можна вылучыць Google Формы», “Google Прэзентацыі”,
“Google Дакументы”, “Google Дыск”.

Усе рэсурсы простыя ў карыстанні і дазваляюць настаўніку разнастаіць працэс навучання.




## Як абысці залежнасць ад інтэрнэт-падключэння?

**Спосаб 1**. Усе кампаніі мабільнай сувязі прапануюць паслугу карыстання 3G мадэмамі. У Беларусі такія мадэмы ласкава называюць “трыджыкамі”. Каштуе “трыджык” адносна танна, акрамя таго, настаўнік можа самастойна выбраць зручны тарыф.

**Спосаб 2.** Большасць вучняў і настаўнікаў карыстаюцца сучаснымі тэлефонамі на платформе Андроід. У кожнага такога смартфона ёсць функцыя, што дазваляе прымяніць тэлефон як кропку Wi-Fi-падключэння. Дастаткова зрабіць неабходныя наладкі – і тэлефон ператвараецца ў “трыджык”. Яго можна пакласці побач з камп’ютарам ці ноўтбукам – і інтэрнэт-сувязь вам забяспечана. Гэты спосаб зручны яшчэ і таму, што дазваляе прадубліраваць падключэнне да Інтэрнэту (у выпадку яго нізкай якасці).

Такім чынам, падключэнне да Інтэрнэту можна наладзіць самастойна, з прымяненнем сучасных тэхналогій, а зрабіць гэта настаўніку дапаможа нават школьнік.



## Плюсы і мінусы выкарыстання ІКТ

Любая тэхналогія навучання, любы сучасны рэсурс мае свае перавагі і недахопы. Гэта можна сказаць і пра прымяненне ІКТ .

### *Недахопы (мінусы)*

- Многае праграмнае забеспячэнне не падтрымлівае беларускую мову, што ставіць настаўнікаў мовы ў вельмі

невыгоднае становішча ў параўнанні з настаўнікамі рускай ці замежнай мовы.

- Калі інтэрактыўная дошка перасоўная, то ўзнікаюць цяжкасці з яе каліброўкай, таму што пры мінімальным руху яна збіваецца і парушаецца сувязь паміж праектарам і паверхняй дошкі. У такім становішчы настаўнік і вучні не могуць поўнасцю выкарыстоўваць усе магчымасці дошкі (пісаць, устаўляць літары).
- Перанасычанасць інфармацыяй. Настаўнік можа вырашыць адразу выкарыстаць усе магчымасці дошкі, што прывядзе да зніжэння актыўнасці вучняў і рассейвання іх увагі.
- Залішняе выкарыстанне дошкі на ўроку. Настаўнік павінен памятаць, што ІКТ - гэта толькі элемент урока, і трэба пастаянна мяняць віды дзейнасці.
- Вялікі аб’ем падрыхтоўкі да ўрока на першым этапе (пры першасным азнаямленні з разнастайнымі рэсурсамі)

***Перавагі (плюсы)***

- Эканомія часу на ўроку. Практыкаванні, што выконваюцца з дапамогай ІКТ, дазваляюць значна паскорыць тэмп заняткаў.
- Павышэнне цікавасці да прадмета. Вучні 5-9 класаў з захапленнем выконваюць заданні на дошцы, з вучнямі старэйшых класаў ІКТ дапамагае падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання.
- Вялікая колькасць гатовых шаблонаў у Інтэрнэце для настаўнікаў-моваведаў.
- Нагляднасць. Інтэрактыўная дошка мае перавагу перад камп’ютарам: матэрыял паказваецца адразу ўсяму класу, а не асобнай групе вучняў, пры гэтым маецца магчымасць групавой і індывідуальнай работы.
- Аператыўнасць ацэнкі ведаў вучняў. За кошт эканоміі часу настаўнік мае магчымасць апытаць большую колькасць вучняў, чым на звычайным уроку, а Інтэрнэт-праграмы дапамогуць вызначыць усе памылкі навучэнца.
- Шырокія магчымасці прымянення ІКТ на факультатыўных занятках і ў пазакласнай дзейнасці (гульні, святы мовы, падарожжы, завочныя экскурсіі і г д.).
- Магчымасць стварэння гіпер- і інтэртэкстаў.
- Прафесійны рост настаўніка, павышэнне яго камп’ютарнай граматнасці.



**ПАМЯТКА**

**Магчымасці прымянення ІКТ на розных этапах урока**

## Варыянты ўрока з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій

**Вучэбны ўрок з мультымедыйнай падтрымкай (урок дэманстрацыйнага тыпу)**

Месца правядзення: вучэбны клас.

На такім ўроку ў класе выкарыстоўваецца адзін камп’ютар, якім карыстаецца настаўнік у якасці “электроннай дошкі”. З гэтай мэтай ва ўстанове адукацыі, акрамя камп'ютарных класаў, рэкамендуецца мець мабільны камп'ютар з мультымедыйным праектарам, які дазваляе аператыўна арганізаваць урок з камп'ютарнай падтрымкай па любым вучэбным прадмеце ў любы час. У якасці праграмнага забеспячэння мэтазгодна выкарыстоўваць матэрыялы гатовых праграмных прадуктаў на CD, DVD, якія змяшчаюць вялікі аб'ём фота-, відэа-, аўдыёматэрыялаў інфармацыі па розных тэмах.

**Урок з камп’ютарнай падтрымкай**

Месца правядзення: камп'ютарны клас; вучэбны клас, у якім пастаянна знаходзяцца 2-3 камп'ютары (навучэнцы працуюць за камп'ютарамі ў групах ці па чарзе).

На такіх уроках навучэнцы працуюць з вучэбным дапаможнікам (тэкставым матэрыялам, малюнкамі), а таксама выконваюць практычныя заданні, практыкаванні трэніровачнага і кантралюючага характару. Пры такой арганізацыі ў педагога з'яўляецца магчымасць правесці аналіз ўзроўню ведаў вучняў і даць ім аб'ектыўную ацэнку, а таксама выявіць прабелы ў ведах.

Да дадзенага віду ўрока можна аднесці:

- ***урокі камп'ютарнага тэсціравання*** (мяркуюць індывідуальную работу за камп'ютарам);
- ***урокі канструявання*** (навучэнцы працуюць за камп’ютарам індывідуальна або ў групе).

На такіх уроках, як правіла, выкарыстоўваецца камп’ютарнае асяроддзе, якое дазваляе вырашаць пэўны тып задач. Напрыклад, гэта можа быць трэнажор для карэкціроўкі ведаў па арфаграфіі.

**Інтэграваны ўрок (інтэграванне з інфарматыкай)**

Рэкамендуецца інтэграваныя ўрокі праводзіць у камп'ютарным класе, дзе ў вучняў арганізаваны доступ да камп'ютараў. Такі ўрок рэкамендуецца праводзіць настаўніку-прадметніку і настаўніку інфарматыкі. Настаўнік-прадметнік ставіць задачу, разам з навучэнцам аналізуе прамежкавыя і выніковыя вынікі, робіць высновы. Настаўнік інфарматыкі дапамагае навучэнцам пабудаваць прадставіць вынік.

**Традыцыйны ўрок з выкарыстаннем інтэрнэт-рэсурсаў**

На такім уроку рэкамендуецца выкарыстоўваць у якасці вучэбна-метадычнага суправаджэння як розныя электронныя навучальныя выданні на CD-, DVD-носьбітах (падручнікі, навучальныя дапаможнікі, хрэстаматыі, задачніка, слоўнікі, даведнікі, тэсты, знакавыя аб'екты, статычныя і дынамічныя мадэлі і г.д.), так і адукацыйныя інтэрнэт-рэсурсы.




**Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій на розных этапах урока**

**Праверка дамашняга задання**

З дапамогай кантролю можа быць ўстаноўлена ступень засваення матэрыялу.
Можна выкарыстоўваць:

***мультымедыйныя тэхналогіі:***

* прэзентацыя-кантроль – для арганізацыі самаправеркі, узаемаправеркі дамашняга задання або заданняў для першаснага замацавання; можна выкарыстоўваць прэзентацыю-тэст, у канцы пазначыць крытэрыі ацэньвання працы (PowerPoint);

* прэзентацыя-тэст з анімацыяй – змяшчае фармулёўку задання і варыянты адказу, з дапамогай анімацыі адзначаецца правільны адказ (PowerPoint);

* прэзентацыя-тэст з гіперспасылкамі – змяшчае фармулёўку задання і варыянты адказу, з дапамогай гіперспасылкі арганізуецца пераход на слайд з інфармацыяй аб правільнасці выбару адказу. У выпадку правільнага выбару ажыццяўляецца пераход на наступнае пытанне; калі ж адказ няправільны, адбываецца вяртанне на гэтае ж пытанне (PowerPoint).

***дыдактычны матэрыял:*** тэсты (Excel) (Word); карткі (Word); крыжаванкі (Excel); самастойныя работы (Word); кантрольныя работы (Word).

**Тлумачэнне новага матэрыялу**

Пры вывучэнні новага матэрыялу наглядны малюнак з'яўляецца візуальнай апорай, якая дапамагае найбольш поўна засвоіць матэрыял. Суадносіны паміж словамі настаўніка і інфармацыяй на экране могуць быць рознымі.

Можна выкарыстоўваць:

***мультымедыйныя тэхналогіі:***

* прэзентацыя-лекцыя-дэманстрацыя слайдаў, якія змяшчаюць ілюстрацыі, тэзісы, відэаролікі ці гук для тлумачэння новага матэрыялу, абагульнення,

сістэматызацыі (PowerPoint), у дадзеным выпадку выкарыстоўваюцца прэзентацыі з мэтай пазнаёміць навучэнцаў з аб'ектам або з'явай, працэсам;
* відэафрагменты фільмаў;
* прэзентацыя-мадэль – з дапамогай анімацыі ствараецца мадэль якога-небудзь працэсу, з'явы, (PowerPoint);
* слайд-шоу – дэманстрацыя ілюстрацый з мінімальнай колькасцю тэксту, з накладаннем музыкі, з устаноўкай аўтаматычнай змены слайдаў, часам з цыклічным паўторам слайдаў (PowerPoint);
* выява – карэкціроўка фатаграфій, размалёўванне малюнкаў (PhotoShop);
* калаж – стварэнне ўласных арыгінальных рэбусаў, малюнкаў (PhotoShop);
* відэакліп (на аснове фатаграфій, відэа-і гукавых файлаў; з выкарыстаннем эфектаў і пераходаў, ствараецца дэманстрацыйны ролік (Movie Maker)
***камп'ютэрныя тэхналогіі:*** дыяграмы (Excel); схемы (Excel); табліцы (Word) .

**Замацаванне і сістэматызацыя ведаў.**

Сістэматызацыя і замацаванне матэрыялу неабходныя для лепшага запамінання і выразнага структуравання. З гэтай мэтай у канцы ўрока праводзім агляд вывучанага матэрыялу, падкрэсліваючы асноўныя палажэнні і іх узаемасувязь.

Можна выкарыстоўваць:

***мультымедыйныя тэхналогіі:***

прэзентацыя-заданне – змяшчае фармулёўку задання, з дапамогай анімацыі арганізуецца паэтапнае рашэнне задання і адказ (PowerPoint).

***мабільны клас:***

* праца ў групе-заданне-скласці тэкст для слайдаў прэзентацыі (PowerPoint);
* выбраць ілюстрацыйнае суправаджэнне для тэксту (PhotoShop, PowerPoint);

***інтэрнэт-рэсуры***

Белава Марыя Віктараўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

**Тэма. Жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля. Адлюстраванне разнастайнасці жыцця і яго праяў у лірычных мініяцюрах “Загадка”, “Трохі пра вечнае”**

**Мэта:** абагульненне і паглыбленне ведаў пра жыццё і творчасць Янкі Брыля, асэнсаванне ідэйнага зместу і мастацкіх асаблівасцей лірычных мініяцюр, выхаванне патрыятычных пачуццяў.

**Задачы:**

- абагуліць і сістэматызаваць веды пра жыццё і творчасць Я. Брыля праз выкарыстанне прэзентацыі “Жыццёвы і творчы шлях Я. Брыля”, работу з падручнікам;
- высветліць спосабы паказу разнастайнасці жыцця і яго праяў праз аналіз ідэйнага зместу і мастацкіх асаблівасцей лірычных мініяцюр;
- развіваць камунікатыўную культуру праз работу ў групах, самаацэнку, узаемаацэнку дзейнасці на ўроку;
- выхоўваць патрыятычныя пачуцці праз дэталёвае асэнсаванне паводзін герояў, іх любові да сваёй зямлі.

**Тып:** урок камбінаванай будовы з выкарыстаннем ІКТ

**Формы і метады працы на ўроку**: гутарка, індывідуальная праца, работа ў групах, часткова-пошукавы метад, выразнае чытанне, тэставыя заданні.

Узаемасувязь з атрыманымі раней ведамі: зварот да зместу апавяданняў Я. Брыля “Маці”, “Сірочы хлеб”, “Mementomori”.

**Абсталяванне:** Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 11 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (2021); тэсты; мультымедыйная прэзентацыя “Жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля”, тэматычная выстава, прысвечаная творчасці Янкі Брыля. Камп’ютар.

**Эпіграф**: “Калі я чытаю добрую кнігу, не папракайце мяне ў гультайстве. Не хочаце прызнаць, што я працую, дык думайце, што я малюся – Слову”.

Я. Брыль

Ход урока

**І. Арганізацыйны этап**

***Мэта:***_псіхалагічная падрыхтаванасць класа да ўрока, арганізацыя ўвагі вучняў._

***Педагагічная задача***: *арганізаваць і падрыхтаваць вучняў да працы.*

Дэманструецца фрагментз тэлевізійнага праекта “Запіскі на палях”. Тэма “Янка Брыль: лёс марпеха”(працягласць 2 хв. 35 сек).

https://www.youtube.com/watch?v=aT3yJEpQlW4

*Настаўнік.* Дарагія рабяты! Сённяшні ўрок мы пачалі з відэа, дзе да нас звяртаецца сам Янка Брыль. Ён пранікнёна і шчыра гаворыць пра чалавечы лёс, звяртае ўвагу на гісторыю свайго доўгага вяртання дамоў, якое ён назаўсёды захаваў і ў памяці, і на паперы. А ў тым, што яго творчы набытак

багаты, я прапаную вам пераканацца, скіраваўшы ўвагу на выставу яго твораў.
*(настаўнік або загадзя падрыхтаваны вучань) дэманструе выданні, змешчаныя на выставе, даючы ім кароткую характарыстыку)*
*Настаўнік.* Асобныя творы пісьменніка вы вывучалі ў папярэдніх класах. Давайце іх прыгадаем.
Прыкладны адказ першага вучня:
(*Мы вывучалі апавяданне "Маці", урывак з аповесці "Сірочы хлеб" і апавяданне "Memento mori").*
Настаўнік:
Якія тэмы і праблемы знайшлі ўвасабленне ў вывучаных раней творах?
Прыкладны адказ другога вучня:
- У апавяданні "Маці" расказваецца пра сціплую і мужную беларускую жанчыну-маці. Шмат гора зведала яна на сваім вяку: парабкоўства, смерць мужа, вайну, трывогу за сыноў Уладзіка, Сцяпана і Васіля.

У хаце маці ў вайну знайшлі кавалак хлеба, шклянку малака і мацярынскую пяшчоту байцы, што ўцяклі з фашысцкага лагера. За гэты ўчынак маці расплачваецца жыццём. Ідучы "ад роднай хаты да свежай ямы ў лапухах", яна думае не пра сябе і не пра непазбежнасць смерці. Маці моліцца за сваіх і чужых сыноў…
Прыкладны адказ трэцяга вучня:
- Падзеі, апісаныя ў аповесці "Сірочы хлеб" адбываюцца ў былой Заходняй Беларусі, якая ў 1921 годзе была аддадзена пад уладу Польшчы. У пачатку аповесці Даніку было ўсяго сем гадоў. Ён па-дзіцячы глядзіць на свет і жыве сваімі радасцямі і засмучэннямі. Даніку вельмі хочацца ў школу. Яна вабіць хлопчыка новым незнаёмым светам, які жывуць старэйшыя вучні, а яшчэ вельмі хочацца абуць новыя бліскучыя боцікі (першыя ў жыцці!), што мама купіла да школы. У канцы аповесці Даніку дванаццаць гадоў і сярод аднакласнікаў ён вылучаецца асаблівымі здольнасцямі да навукі. Ён не можа мірыцца з тым, што ў школе дзеці вучацца на чужой мове, што багатыя яго аднакласнікі насміхаюцца з беднасці іншых дзяцей.
Вялікі ўплыў на фарміраванне светапогляду Даніка аказалі ўмовы жыцця, а таксама дарослыя. Яму пашчасціла сустрэцца з цудоўнымі настаўнікамі: вясковым чалавекам Міколам Кужалевічам і польскай настаўніцай пані Мар'яй. Мікола Кужалевіч адкрыў Даніку сілу еднасці, братэрства працоўных, гаварыў пра нацыянальную годнасць беларусаў, а пані Мар'я вучыла дабрыні і павазе ў адносінах да іншых, прывівала любоў да літаратуры. (У вобразе Даніка Мальца мы бачым самога Янку Брыля ў дзяцінстве).
Прыкладны адказ чацвёртага вучня:
-А я хачу сказаць пра апавяданне "Memento mori". Лацінскі выраз "Memento mori" (што азначае "памятай пра смерць") даў назву невялікаму апавядальнаму твору, сюжэт якога заключаецца ў наступным.
"Позняй восенню сорак трэцяга года на адным з самых спакойных перагонаў Беларускай чыгункі ўзарваўся нямецкі вайсковы эшалон.

Праз дзень, халодным, золкім досвіткам, бліжэйшую да месца катастрофы вёску акружылі карнікі.Вёска была вялікая, але “накрыць” яе ўдалося хутка і спраўна. Жыхары сагнаны былі ў той канец вёскі, дзе стаяла старая вялізная адрына, - усё, што ўцалела ад калгаснай фермы.
Зондэрфюрэр, начальнік экспедыцыі, пазнае ў натоўпе знаёмага печніка і дае яму дазвол на ўратаванне. Але той адказвае, што там яго жонка і дачка з малымі дзеткамі, суседзі і ўсе добрыя людзі…
У жудасным ляманце стрэл амаль не пачуўся.
Але пячнік упаў.
Тады вароты назаўсёды зачыніліся.
І ён згарэў - адзін, хто мог бы ў той дзень не згарэць.
І ён жыве”.

Мы, маладое пакаленне, не бачылі жахаў вайны, але ўпэўнены ў тым, што не трэба забываць аб зверствах фашыстаў, якія прывялі да знішчэння кожнага чацвёртага жыхара Беларусі. Гэта балюча адгукаецца і сёння ў нашых сэрцах.

**ІІ. Арыентацыйна-матывацыйны этап**

***Мэта:*** *садзейнічаць актывізацыі суб’ектыўнага вопыту вучняў, развіццю пазнавальнага інтарэсу, матывацыі, самавызначэнню на вынік урока.*

***Педагагічная задача:*** *сфарміраваць пазнавальныя матывы, стварыць умовы для самавызначэння вучняў на дзейнасць і яе вынікі.*

**Настаўнік**. Вы стаіце на парозе самастойнага жыцця, і будзе вельмі карысна, калі ў рамках урока зможаце адкрыць для сябе нешта новае.Вы будзеце вырашаць шматлікія пытанні для дасягнення сваіх жыццёвых мэтаў; таму, пасля знаёмства з тэмай, я прапаную сфармуляваць мэты для працы на сённяшнім уроку.

(Тэма агучваецца настаўнікам, затым вучні прапануюць фармулёўку мэтаў для рэалізацыі на ўроку, настаўнік (пры неабходнасці) дапамагае).

**Мэты на мове вучняў:**

-даведаюся пра невядомыя мне раней факты з біяграфіі Я. Брыля;
-удасканалю ўменне аналізаваць ідэйны змест твораў у адпаведнасці з вызначанай тэмай;
-даведаюся пра асаблівасці адлюстравання жыцця ў лірычных мініяцюрах.

Настаўнік падсумоўвае сказанае, звяртаецца да эпіграфа ўрока, вядзе суразмоўніцтва з вучнямі па змесце прыведзенага выказвання і прапануе зрабіць крок да паглыблення ведаў па біяграфіі Я. Брыля і яго творчасці.

**ІІІ. Аперацыйна-пазнавальны этап**

***Мэта***: *усведамленне вучнямі асноўнага зместу вучэбнага матэрыялу, які вывучаецца на ўроку, пазнавальная актыўнасць вучняў.*

***Педагагічная задача***: *арганізаваць мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць вучняў па тэме ўрока.*

**Прадстаўленне кросэнса па творчасці Я. Брыля** (вучань, які меў індывідуальнае апераджальнае заданне, прапануе аднакласнікам растлумачыць змест кросэнса).

Спасылка на кросэнс.
https://clck.ru/33MY39

Матэрыял для прадстаўлення кросэнса:

1.Як вядома лёс Я. Брыля быў звязаны з жыццём у былой Заходняй Беларусі.Працоўныя Заходняй Беларусі цярпелі жорсткі нацыянальны прыгнёт і поўнае палітычнае бяспраўе. Беларусаў не лічылі нацыяй. Ажыццяўлялася гвалтоўная паланізацыя беларускага насельніцтва: закрываліся існаваўшыя дагэтуль беларускія школы, настаўніцкія семінарыі, якія з'яўляліся базай падрыхтоўкі педагогаў для гэтых школ, спыняліся выданні беларускіх газет, забаранялася ўжыванне беларускай мовы ў дзяржаўных установах

Працоўныя Заходняй Беларусі не мірыліся са сваім цяжкім становішчам, вялі барацьбу супраць прыгнятальнікаў.

2. Мне здаецца, што малюнак, прадстаўлены ў другім квадраце, адносіцца да аповесці Я. Брыля “Сірочы хлеб”, а на малюнку– Данік Малец – галоўны герой твора.

Дзеянне ў аповесці адбываецца ў Заходняй Беларусі, у вёсцы Галынка. Частка Беларусі ў 1921 годзе ў выніку Рыжскай дамовы адышла да Польшчы. У Заходняй Беларусі ўсталяваліся жорсткія парадкі: урад Польшчы не прызнаваў беларусаў за нацыю, вёў прымусовае апалячванне, забараняў беларускамоўныя школы, абмяжоўваў правы беларусаў на вучобу, друк, бібліятэкі, таварыствы.

3. Мы ведаем, што значнае месца ў творчасці Я. Брыля займае раман “Птушкі і гнёзды”. Галоўны герой рамана – Алесь Руневіч з заходнебеларускай вёскі Пасынкі. Прататыпам галоўнага героя з’яўляецца сам аўтар. Алесь, як і Янка Брыль, служыў у польскім войску, а пасля нападу нацысцкай Германіі трапіў у палон. Перажываючы пагарду да свайго нацыянальнага не толькі з боку немцаў, але і здраднікаў, Алесь надта балюча гэта ўспрымае. У яго душы расце перакананасць, што і шматпакутнаму беларускаму народу “нароўні з усімі дадзена права жыць сапраўдным жыццём”. Як птушка да пакінутага гнязда, імкнецца герой да роднай Беларусі.

4. Мяркую, што гэта ілюстрацыя да апавядання “Маці”, якое нам добра знаёма. Там расказваецца пра жанчыну, якая дапамагла чырвонаармейцам, хоць ведала, што яе чакае пакаранне.

5. Пяты квадрат падае эпізод, калі фашысты зганяюць людзей у адрыну, каб потым знішчыць. Думаю, што гэта можа быць аднесена да апавядання Янкі Брыля “Memento mori” (што значыць “памятай пра смерць”). Адзін з герояў твора можа застацца жывы – гэта пячнік, якога пазнае зондэрфюрэр. Але ён не хоча выратавацца адзін, хоча, каб усіх людзей адпусцілі. Ён загінуў разам з усімі. І ён жыве. Жыве разам з тымі, хто не шкадаваў свайго жыцця за свабоду і незалежнасць, за нашу шчаслівую будучыню…

6. Наступны квадрат змяшчае выяву музычнага інструмента ліры і мініяцюрных кніг. Таму з упэўненасцю магу сказаць, што сэнс гэтай выявы – лірычная мініяцюра.

7. Малюнак вёскі і ракі дае права меркаваць, што гэта можна аднесці да зместу лірычнай мініяцюры “Загадка”, галоўны герой якой, рускі хлопец з-за Дона, усёй душой і сэрцам прыкіпеў да беларускай вёскі – і стала ў яго дзве радзімы.
8. Малюнак трох дубоў – гэта не што іншае, як зварот да мініяцюры “Трохі пра вечнае”.
9. А 9 квадрат (цэнтральны) змяшчае пытальнік, бо кожны можа прапанаваць свой варыянт запісу ці ілюстрацыі (можа быць прадстаўлены партрэт Я. Брыля, а яшчэ можна змясціць запіс “Шматграннасць творчасці Я. Брыля” і інш).
(пасля адказу праводзіцца прамежкавая рэфлексія).
**Выступленне-прэзентацыя “Жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля”** (прадстаўляе загадзя падрыхтаваны вучань).
Спасылка на прэзентацыю.
https://clck.ru/33SbX2
(Пасля выступлення вучня неабходна правесці ацэнку працы без выстаўлення адзнакі ці з выстаўленнем (па меркаванні настаўніка).

**3. Знаёмства з лірычнай прозай.**

Настаўнік прапануе пазнаёміцца з паняццямі лірычная проза і лірычная мініяцюра (вучні звяртаюцца да вучэбных дапаможнікаў, асноўныя паняцці запісваюць у сшыткі па літаратуры).

Лірычная проза – стылёвая плынь мастацкай прозы, якая вылучаецца павышанай эмацыянальнасцю і адкрытым, непасрэдным адлюстраваннем аўтарскіх адносін да паказу. У ёй спалучаюцца рысы лірычнага і эпічнага адлюстравання рэчаіснасці.

Характэрныя жанравыя формы лірычнай прозы: эпісталярныя, дзённікавыя, аўтабіяграфічныя творы, падарожныя нататкі і эсэ.

Да лірычнай прозы адносіцца і жанр мініяцюры. Творы гэтага жанру ўяўляюць сабой невялікае апавяданне, у якім амаль няма дзеяння, але есць асабістае суб’ектыўнае ўражанне ад рэальных, канкрэтных фактаў жыцця. Лірычная мініяцюра як жанр мае сціслы аб’ём, свабодную кампазіцыю, афарыстычнасць, суб’ектыўнасць, імкненне дабессюжэтнасці і цыклічнасці. Для твораў гэтага жанру характэрна перадача пачуццяў і ўражанняў ад успрымання рэчаіснасці. Менавіта таму тут выражаны суб’ектыўна аўтарскі пачатак, індывідуальна-пісьменніцкае адлюстраванне жыцця.

Настаўнік прапануе навучэнцам звярнуцца да вучэбнага дапаможніка (с. 51-52). Пасля самастойнага прачытання прапанаванага матэрыялу настаўнік задае пытанні:
Калі Я. Брыль звяртаецца да малых жанравых формаў?
- Якія вы ведаецехарактэрныя жанравыя формы лірычнай прозы?

4. **Зварот да лірычнай мініяцюры “Загадка”.**

- Ахарактарызуйце галоўнага героя лірычнай мініяцюры “Загадка”
- Як і чаму змяніліся адносіны героя мініяцюры Янкі Брыля “Загадка” да характару і светаўспрымання беларусаў? Раскрыйце сэнс назвы твора.

- Якія “імгненні жыцця” для лірычнага героя сталі лёсавызначальнымі і чаму?

5. **Зварот да лірычнай мініяцюры “Трохі пра вечнае”.**

- Раскрыйце ідэйны сэнс мініяцюры “Трохі пра вечнае”
- Якую ролю адыгрывае вобраз дубоў?
- Што аўтар расказвае пра буслоў? Якая роля адводзіцца гэтым вобразам у мініяцюры?
- Ці ўспрымаецца смерць сястры лірычнага героя трагічна?
- Што сцвярджае пісьменнік-філосаф у лірычнай мініяцюры “Трохі пра вечнае?”. Над чым прымушае задумацца?

Паразважайце, чаму лірычныя мініяцюры занялі вызначальнае месца ў творчай спадчыне Я. Брыля.

(пры адказах на пытанні пажадана выкарыстоўваць цытаты).

**6. Работа ў групах.**

*(дзяленне на групы ажыццяўляецца згодна з выбарам вучняў пасля агучвання зместу дзейнасці груп).*

На выкананне заданняў адводзіцца да 10 хвілін.

**Першая група.** Уявіце, што вы працуеце ў выдавецтве і атрымалі заданне падрыхтаваць вокладку новага выдання лірычных мініяцюр Я. Брыля.

Выканайце заданне і патлумачце свой выбар(работа можа выконвацца як з дапамогай камп’ютараў, так і з дапамогай мабільных тэлефонаў).

Група дэманструе вынікі працы (Дадатак 1).

**Другая група**. Вы прачыталі лірычную мініяцюру Я. Брыля “Трохі пра вечнае”. Абапіраючыся на змест твора, падрыхтуйце выступленне ў жанры мініяцюры “Што чалавеку патрэбна для шчасця” або ўявіце, што вы ўдзельнік праекта “Роўны навучае роўнага” (напішыце невялікае выступленне). Група прадстаўляе вынікі працы (Дадатак 2).

**Трэцяя група**. Вам прапанавалі напісаць пост у інтэрнэце “Калі б Янка Брыль быў маім сучаснікам, то…”

Прадэманструйце, калі ласка, вынік сваёй працы(Дадатак 3).

Слова кіраўнікам груп (агучваюць заданні і прадстаўляюць вынікі, затым праводзіцца ацэнка вынікаў працы вучняў у групах).

**IV. Кантрольна-ацэначны этап**

***Мэта*: *высвятленне вучнямі сваёй кампетэнтнасці па тэме ўрока.***

***Педагагічная задача*: *стварыць умовы для самакантролю, карэкцыі і ацэнкі ведаў, уменняў і дзейнасці вучняў.***

Праводзіцца тэставы кантроль па тэме “Я. Брыль. Лірычныя мініяцюры “Загадка”, “Трохі пра вечнае”.

**С**пасылка на тэставыя заданні, размешчаныя на адзіным інфармацыйна-адукацыйным рэсурсе.

https://eior.by/catalog_lecture/11-klass/bellit/5.php

(Тэставыя заданні могуць быць раздрукаваны на паперы).

А1.Адзначце, на якія разнавіднасці размяркоўваў Янка Брыль мініяцюры?

1. нарысы
2. замалёўкі

3. лірычныя нататкі
4. лірычныя запісы
5. апавяданні
A2. Мініяцюра – замалёўка пэўнага, важнага для пісьменніка “імгнення жыцця”, у якой аўтар часам перадае цэлы чалавечы характар і лёс.
1. Правільнае сцвярджэнне
2. Няправільнае сцвярджэнне
A3.Адзначце год выхаду першай кнігі мініяцюр Янкі Брыля “Жменя сонечных промняў”:
1. 1965
2. 1969
3. 1972
4. 1977
A4. Суаднясіце назвы і герояў мініяцюр Янкі Брыля:
А-герой умее заўважаць прыгажосць вакол сябе, прырода для яго – неад’емная частка існавання
Б-рускі хлопец з Дона, які да вайны праходзіў вайсковую службу ў Беларусі, быў пагранічнікам
1.“Загадка”-
2.“Трохі пра вечнае”-
A5.Адзначце, праз што раскрываецца характар героя ў мініяцюры “Загадка”:
1. праз моўную характарыстыку
2. праз партрэт
3. праз падзеі, звязаныя з яго асабістым жыццём
4. праз адносіны вяскоўцаў з далёкай станіцы
A6.Назавіце лёсавызначальныя моманты жыцця героя мініяцюры “Загадка”:
1. горкае адступленне і палон
2. уцёкі з няволі
3. прытулак у беларускай вёсцы
4. каханне і жаніцьба з мясцовай дзяўчынай
5. вяртанне на Дон
A7.Адзначце, пра што думае Янка Брыль у мініяцюры “Трохі пра вечнае”, назіраючы за бусламі і любуючыся іх прыгажосцю:
1. што пісалі пра іх А. Міцкевіч і М. Рыльскі
2. пра каментарый акадэміка С. Піганя да паэмы “Пан Тадэвуш”
3. пра рымскага паэта Авідзія
4. пра смерць сястры героя
5. пра каханне
A8.У мініяцюры “Трохі пра вечнае” Янка Брыль запрасіў чытача задумацца над заканамернасцямі хуткаплыннага і вечнага жыцця, у якім ёсць месца нараджэнню і смерці.
1. Правільнае сцвярджэнне
2. Няправільнае сцвярджэнне
A9.Адзначце, як назваў бусла аўтар мініяцюры “Трохі пра вечнае”:
1. сімвалам шчасця

2. вечнай паэзіі
3. белым сцягам вясны
А10. Устаўце на месцы пропуску неабходнае слова.
У мініяцюры "Трохі пра вечнае" _________Брыль сцвярджаў, што чалавек павінен імкнуцца да адчування радасці ад успрымання неабсяжнага навакольнага свету і людзей.

**2. Самакантроль і ўзаемакантроль.**
Адказы: А1– 2,3, 4; А2 –1; А3 –1; А4 – Б-1, А-2;А 5 –3, 4;А 6 –1, 2, 3, 4;А 7–1, 2, 3;
А 8 –1; 9 –3; А 10 – Янка.

**V.Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак**
Зварот да мэтаў і задач урока.
Ацэнка ступені засваення вучнямі вучэбнага матэрыялу.
Каменціраванне адзнак, якія выстаўляюцца за працу на ўроку.

**VI. Рэфлексія**
(выкарыстоўваецца метад "Незакончаны сказ" ці "Віртуальны рэфлексійны ліст")
- Сёння на ўроку было цікава…
- Мне было складана…
- У мяне засталіся нявырашаныя пытанні па…
- Хачу падзякаваць за …
- Мне неабходна дапрацаваць…
- У мяне атрымалася…
- Я змог (змагла) рэалізаваць…
- На ўроку было камфортна, таму што…
- Атрыманыя веды спатрэбяцца…

**VII. Дамашняе заданне.**Скласці храналагічную табліцу па творчасці Васіля Быкава (с. 56-64) або падрыхтаваць вуснае паведамленне "Ваенная проза Васіля Быкава";(*індывідуальнае заданне*: падрыхтаваць буктрэйлер да аповесці Васіля Быкава "Знак бяды".

Дадатак 1




(Вокладка кнігі  Янкі Брыля “Зборнік лірычных мініяцюр” нашай групе ўяўляецца  такой: партрэт Янкі Брыля  на фоне прыроды, дзе перавага аддаецца восеньскім фарбам, з якімі асацыіруецца лёгкі сум, што знаходзіць адлюстраванне ў лірычных мініяцюрах.  Ёсць выява трох дубоў, што стаяць на варце незалежнасці краіны. А малюнак, дзе паказана зброя, адлюстроўвае думку аб тым, што беларусы заўсёды змогуць  абараніцца ад ворагаў, паколькі  ў нашай краіне жывуць мужныя і самаадданыя людзі).

Дадатак 2

Шчасце ў мэтах і самарэалізацыі

Кожны з нас хоча самарэалізавацца ў жыцці, рухаючыся наперад і развіваючыся. Нам хочацца пакараць новыя вяршыні, развіваць свой патэнцыял, дамагацца большага. Але калі мэты недасяжныя,  то рэалізавацца не атрымліваецца і перспектывы няясныя. Тады адчуваеш сябе няшчасным і сумным.Лічыш, што жыццё не атрымалася і ўсё скончана.  Не, гэта не так!Дзесьці, магчыма, былі дапушчаны пралікі і ты зайшоў у тупік.  Пара задумацца над тым, як выйсці з дадзенага становішча. Часам не атрымліваецца рэалізаваць запланаванае па прычыне залішняй ляноты, баязлівасці або апатыі. Разбярыся ў тым, што табе  перашкаджае. А для таго, каб проста жыць паўнавартасным жыццём, дастаткова займацца любімай справай.  Знайдзі сабе занятак па душы, не бойся ісці наперад. Поспехаў табе, дружа!

Дадатак 3

Вітаю ўсіх сваіх падпісчыкаў і прапаную далучацца тых, хто неабыякавы да творчасці класікаў беларускай літаратуры. Сённяшнія развагі будуць пра Янку Брыля. Думаецца,што калі б Янка Брыль быў нашым сучаснікам і вёў свой блог у інтэрнэце, то шмат чаго цікавага змог бы расказаць маладому пакаленню.
Уяўляю, як яго дужыя рукі хуценька перабіраюць пальцамі па клавіятуры… Аб чым жа ён піша? Магчыма, разважае пра лёс маці, якая не пашкадавала свайго жыцця ў час вайны, ці спрабуе дапамагчы Даніку Мальцу з “Сірочага хлеба?” А можа, дапісвае “Загадку” і разважае “Трохі пра вечнае?”
Сапраўды, Янка Брыль змог бы скласці сур’ёзную канкурэнцыю сучасным блогерам. А вы як лічыце?

*(тэкст можа быць напісаны як ад першай асобы, так і ад групы вучняў).*

Шимко Марина Александровна,

